**П. І. Міхедава**

# КАСМІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ЛІРЫЦЫ Я.КУПАЛЫ

Янка Купала – паэт касмічнага светаадчування і маштабнага мыслення, які ў сваёй творчасці яднае мінулае і будучыню, рэальнае і фантастычнае, зямное і нябеснае. Ключом для разумення паэзіі Я. Купалы можа быць ягоны псеўданім. Як вядома, паэт нарадзіўся ў чароўную купальскую ноч, на касмічнае свята летняга сонцастаяння, калі ўсё на зямлі прасякнута жыццядайнай энэргіяй сонца. Абраўшы такі псеўданім, Я. Купала нібы ўказвае на генезіс свайго таленту ад прыродных стыхій, якія ў гэту ноч дасягаюць найвялікшай моцы. Вобразы-сімвалы сонца, агню, зорак, папараць-кветкі з'яўляюцца скразнымі ў творах Купалы і супрацьпастаўляюцца смерці, заняпаду, духоўнаму здранцвенню. Варта таксама адзначыць, што падзеі Купалавых твораў часта адбываюцца падчас Купалля або Куцці – касмічных святаў, звязаных з летнім і зімовым сонцастаяннем.

Паэт адчувае сваю крэўную сувязь са стыхіямі: “Мой дом – прыволле звёзднай далі, // Арламі мераны абшар”; “Зямлі і небу нізка пакланюся // Я сын зямлі, і сонца вольны сын!”; “З зямлёй і небам звязывае мяне ніць // Неразарваная веквечна павуціна”. Адчуванне сваёй далучанасці да Сусвету – галоўны элемент філасофіі, якой прытрымліваеццца паэт пры напісанні сваіх вершаў. Часам здаецца, што Я. Купала глядзіць на ўсё, пра што піша, з вышыні сонца, зораў, аблокаў. Вобразы яго паэзіі заўсёды маштабныя і

максімальна абагульненыя. Купала бачыць макрасвет, але адметна тое, што такі вертыкальны позірк з вышыні не дае магчымасць убачыць мікрасвет, таму паэзія Купалы пазбаўлена вобразаў канкрэтных рэалій, дэталяў зямной рэчаіснасці.

Частотным у паэзіі Я. Купалы з’яўляецца вобраз зор, якія асацыююцца з таямніцамі сусвету, з духоўнымі арыенцірамі. Пакрытае хмарамі бяззорнае неба – сімвал цяжкага, беспрасветнага зямнога існавання. Сонца ў паэзіі Купалы – вобраз светлай будучыні, асабліва вясновае і купальскае, яно сімвалізуе духоўнае адраджэнне народа. Цікавым будзе параўнанне двух вершаў з розных перыядаў творасці паэта: "Захад сонца" і "Світае". Першы верш быў напісаны ў змрочным паслярэвалюцыйным 1907 г. і пазначаны глыбокім песімізмам. У другім, напісаным у 1919 г., вобраз світання звязаны з будучыняй, якую беларусы павінны стварыць уласнымі сіламі “Эй, годзе ўжо спаць! Уставайце! // Гляньце – світаць пачало”.

У кожным вершы паэта вобразы сонца, святла, агню, зораў, віхураў набываюць новыя нюансы і адцені сэнсаў. Гэта можа быць і барацьба, і адраджэнне, і асвета, і свабода, і праўда. Вобразы касмічных стыхій пераплецены ў мастацкім адзінстве і з'яўляюцца арганічнай часткай паэтычнага свету Янкі Купалы.